© Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
**Установа адукацыі «Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў»**

## ДРТ–2022 г.

# Тэматычнае кансультаванне па беларускай мове

| **Заданне.**<br>**Адказ** | **Разбор задання** | **Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу** | **Вучэбны дапаможнік** |
|---|---|---|---|
| **А1.** Адзначце прыклады, у якіх выдзеленыя словы трэба пісаць з вялікай літары:<br>1) птушка (***С/с***)***ініца***;<br>2) стадыён «(***Д/д***)***ынама***»;<br>3) (***П/п***)***алінін*** партфель;<br>4) Гомельская (***В/в***)***обласць***;<br>5) возера (***Н/н***)***арач***.<br><br>**Адказ:** 2,3,5 | 1) *птушка* ***сініца*** → назоўнік, які абазначае назву птушкі, з’яўляецца агульным і пішацца з малой літары;<br>2) *стадыён* «***Дынама***» → узятая ў двукоссе назва спартыўнага комплексу пішацца з вялікай літары;<br>3) ***Палінін*** *партфель* → прыналежны прыметнік, утвораны ад уласнага назоўніка пры дапамозе суфікса ***-ін-***, пішацца з вялікай літары;<br>4) *Гомельская* ***вобласць*** → назоўнік, які абазначае родавую назву адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі, з’яўляецца агульным і пішацца з малой літары;<br>5) *возера* ***Нарач*** → назоўнік, які абазначае назву возера, з’яўляецца ўласным і пішацца з вялікай літары | Фанетыка і арфаэпія. Арфаграфія. Ужыванне вялікай літары | Беларуская мова : вучэб. дапам. для 6-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 24, 48.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 10-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 19 |
| **А2.** Адзначце правільна напісаныя словы:<br>1) жэлацін;<br>2) шалясцець;<br>3) цырымонія;<br>4) мнагапавярховы;<br>5) скутэр.<br><br>**Адказ:** 1,2,3 | 1) *жэлаці́н* → у запазычаным слове пасля зацвярдзелага зычнага гука [***ж***] не пад націскам захоўваецца літара ***э***;<br>2) *ш**а**лясцéць* → у спрадвечна беларускім слове не пад націскам гук [***э***] пераходзіць у гук [***а***], што і передаецца на пісьме: *шэ́лест* – *ш**а**лясцéць*;<br>3) *ц**ы**рымóнія* → у запазычаным слове *цырымóнія* ў адпаведнасці з беларускім літаратурным вымаўленнем пішацца літара ***ы***;<br>4) *мн**о**гапавярхóвы* → у першай частцы складанага слова пішацца літара ***о***, бо ў другой яго частцы націск падае не на першы | Фанетыка і арфаэпія. Арфаграфія. Правапіс галосных ***о***, ***э***, ***а*** | Беларуская мова : вучэб. дапам. для 5-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання : у 2 ч. / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2019. – Ч. 2. – § 9.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 6-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 20.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 10-га кл. устаноў агул. сярэд. |

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў.<br>Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | склад;<br>5) *скýт**а**р* → у запазычаным слове, якое з'яўляецца агульнай назвай, канцавое ненаціскное спалучэнне ***-эр*** у беларускай мове передаецца як ***-ар*** | | адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 8 |
| **А3.** Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску трэба пісаць літару ***я***:<br>1) марм_лад;<br>2) разм_жаванне;<br>3) зерн_склад;<br>4) пасе_ць;<br>5) леб_дзіны.<br><br>**Адказ:** 3,4,5 | 1) *марм**е**ла́д* → у запазычаным слове незалежна ад месца націску пішацца літара ***е***;<br>2) *разм**е**жава́нне* → у спрадвечна беларускім слове не ў першым складзе перад націскам пішацца літара ***е***;<br>3) *зерн**я**скла́д* → у складаным слове ў першым складзе перад націскам пішацца злучальная літара ***я***;<br>4) *пасе́**я**ць* → у суфіксе дзеяслова *пасе́яць* незалежна ад месца націску захоўваецца літара ***я***;<br>5) *леб**я**дзі́ны* → у спрадвечна беларускім слове ў першым складзе перад націскам пішацца літара ***я*** | Фанетыка і арфаэпія. Арфаграфія. Правапіс галосных ***е***, ***ё***, ***я*** | Беларуская мова : вучэб. дапам. для 5-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання : у 2 ч. / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2019. – Ч. 2. – § 10.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 6-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 20.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 10-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 9 |
| **А4.** Адзначце правільна напісаныя словы:<br>1) вакуум;<br>2) даўжыня;<br>3) палрубля;<br>4) аудыенцыя;<br>5) жанчына-ўрач.<br><br>**Адказ:** 1,2,5 | 1) *ва́ку**у**м* → у запазычаным слове, якое заканчваецца на ***-ум***, пішацца літара ***у*** (складовае);<br>2) *да**ў**жыня́* → у сярэдзіне слова пасля галоснага перад зычным не пад націскам пішацца літара ***ў*** (нескладовае);<br>3) *па**ў**рубля́* → у слове пішацца літара ***ў*** (нескладовае), бо адбылося чаргаванне зычнага гука [***л***] з [***ў***]: *па*[***л***]*ова рубля* – *па*[***ў***]*рубля*;<br>4) *а**ў**дые́нцыя* → у сярэдзіне запазычанага слова пасля галоснага перад зычным не пад націскам пішацца літара ***ў*** (нескладовае); | Фанетыка і арфаэпія. Арфаграфія. Правапіс ***у***–***ў*** | Беларуская мова : вучэб. дапам. для 5-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання : у 2 ч. / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2019. – Ч. 2. – § 18.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 10-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 14 |

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў.<br>Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | 5) *жанчына-**ў**ра́ч* → у слове пасля злучка пішацца літара ***ў*** (нескладовае), бо папярэдняе слова заканчваецца на галосны | | |
| **А5.** Адзначце правільна напісаныя словы:<br>1) суб’ектыўна;<br>2) шчолачь;<br>3) адмоўе;<br>4) кур’ер;<br>5) дзьверы.<br><br>**Адказ:** 1,3,4 | 1) *суб’ектыўна* → пасля губнога зычнага гука [***б***] перад літарай ***е***, што абазначае два гукі [***йэ***], пішацца апостраф;<br>2) *шчолач* → пасля зацвярдзелага зычнага гука [***ч***] мяккі знак не пішацца;<br>3) *адмоўе* → пасля ***ў*** (нескладовага) апостраф не пішацца;<br>4) *кур’ер* → пасля зацвярдзелага зычнага гука [***р***] перад літарай ***е*** пішацца апостраф;<br>5) *дзверы* → пасля мяккага зычнага гука [***дз’***] перад мяккім зычным гукам [***в’***] мяккі знак не пішацца, бо пры змене слова ці падборы аднакаранёвых абодва зычныя застаюцца мяккімі: [***дз’в’***]*ярэй*, [***дз’в’***]*ярны* | Фанетыка і арфаэпія. Арфаграфія. Правапіс мяккага знака і апострафа | Беларуская мова : вучэб. дапам. для 5-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання : у 2 ч. / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2019. – Ч. 2. – § 16.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 10-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 18 |
| **А6.** Адзначце правільна напісаныя словы:<br>1) рассартаваць;<br>2) захапленне;<br>3) раздолье;<br>4) разводдзе;<br>5) каллекцыя.<br><br>**Адказ:** 1,2,4 | 1) *ра**сс**артаваць* → спалучэнне аднолькавых зычных гукаў на стыку прыстаўкі і кораня перадаецца падвоеным напісаннем адпаведнай літары (***сс***);<br>2) *захапле**нн**е* → падаўжэнне зычнага гука [***н’***] у становішчы паміж галоснымі перадаецца падвоеным напісаннем адпаведнай літары (***нн***);<br>3) *раздо**лл**е* → падаўжэнне зычнага гука [***л’***] у становішчы паміж галоснымі перадаецца падвоеным напісаннем адпаведнай літары (***лл***);<br>4) *разво**ддз**е* → падаўжэнне зычнага гука [***дз’***] у становішчы паміж галоснымі на пісьме перадаецца спалучэннем літар ***ддз***;<br>5) *ка**л**екцыя* → у слове іншамоўнага паходжання падаўжэнне зычнага гука не адбываецца і пішацца адна літара ***л*** | Фанетыка і арфаэпія. Арфаграфія. Падоўжаныя зычныя, іх правапіс | Беларуская мова : вучэб. дапам. для 5-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання : у 2 ч. / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2019. – Ч. 2. – § 19.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 10-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 16 |

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| **А7.** Адзначце правільна напісаныя словы:<br>1) падпісчык;<br>2) лічба;<br>3) эгзамен;<br>4) лёхкі;<br>5) капустны.<br><br>**Адказ:** 1,2 | 1) *падпі**с**чык* → прыпадабненне свісцячага зычнага гука [***с***] да шыпячага зычнага [***ч***] на пісьме не передаецца (вымаўляем: [*патп'і́**ш**чык*]; правяраем: *падпі**с**аць*);<br>2) *лі**ч**ба* → азванчэнне глухога зычнага гука [***ч***] перад звонкім зычным [***б***] на пісьме не передаецца (вымаўляем: [*л'і́**дж**ба*]; правяраем: *лі**ч**ыць*);<br>3) ***э**кзамен* → вымаўленне глухога зычнага гука [***к***] перад звонкім зычным [***з***] як [***ґ***] выбухны ў запазычаным слове *экзамен* на пісьме не передаецца (вымаўляем: [*э**ґ**за́м'эн*]; пішам: ***э**кзамен*);<br>4) *лё**г**кі* → аглушэнне звонкага зычнага гука [***г***] перад глухім [***к'***] на пісьме не передаецца (вымаўляем: [*л'о́**х**к'і*]; правяраем: *лё**г**енькі*);<br>5) *капу**сн**ы* → гістарычнае спалучэнне зычных гукаў [***стн***] вымаўляецца як [***сн***] і передаецца на пісьме спалучэннем адпаведных літар (***сн***) | Фанетыка і арфаэпія. Арфаграфія. Зычныя гукі. Іх вымаўленне і правапіс. Вымаўленне і правапіс спалучэнняў зычных | Беларуская мова : вучэб. дапам. для 5-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання : у 2 ч. / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2019. – Ч. 2. – § 13, 14, 21.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 10-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 12, 17, 21 |
| **А8.** Адзначце словы, якія ў сваім саставе маюць ***прыстаўку***:<br>1) дакументальны;<br>2) свежасць;<br>3) усмешка;<br>4) падарыць;<br>5) адпаведны.<br><br>**Адказ:** 3,4 | 1) *дакументальны* → слова ў сваім саставе не мае прыстаўкі (аднакаранёвыя словы: *дакумент, дакументаваць*);<br>2) *свежасць* → слова ў сваім саставе не мае прыстаўкі (аднакаранёвыя словы: *свежы*, *асвяжыць*);<br>3) *усмешка* → слова ў сваім саставе мае прыстаўку ***у-*** (аднакаранёвыя словы: *смех*, *рассмяшыць*);<br>4) *падарыць* → слова ў сваім саставе мае прыстаўку ***па-*** (аднакаранёвыя словы: *дар*, *дарыць*);<br>5) *адпаведны* → слова ў сваім саставе не мае прыстаўкі (аднакаранёвыя словы: *адпавядаць*, *адпаведнасць*) | Марфемная будова слова. Словаўтварэнне і арфаграфія. Марфемы як структурна значымыя часткі слова | Беларуская мова : вучэб. дапам. для 6-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 10, 12, 13 |
| **А9.** Адзначце словы, якія трэба пісаць праз злучок:<br>1) (Давыд) Гарадок; | 1) *Давыд-Гарадок* → складаны назоўнік, які абазначае састаўную ўласную геаграфічную | Марфалогія і арфаграфія. | Беларуская мова : вучэб. дапам. для 6-га кл. устаноў агул. сярэд. |

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| 2) (вода) лячэбніца;<br>3) (плашч) палатка;<br>4) (супер) маркет;<br>5) (тэх) персанал.<br><br>**Адказ:** 1,3 | назву, пішацца праз злучок;<br>2) *водалячэбніца* → складаны назоўнік, утвораны шляхам спалучэння дзвюх асноў ***вод-*** і ***лячэбніц-***(*а*) з дапамогай злучальнай літары ***а***, пішацца разам;<br>3) *плашч-палатка* → назоўнік з прыдаткам пішацца праз злучок;<br>4) *супермаркет* → назоўнік з першай іншамоўнай часткай ***супер-*** пішацца разам;<br>5) *тэхперсанал* → складанаскарочаны назоўнік, утвораны з часткі слова ***тэх****нічн-*(*ы*) і поўнага слова ***персанал-***☐, пішацца разам | Складаныя назоўнікі, іх утварэнне і правапіс | адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 41.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 10-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 20 |
| **А10.** Адзначце словы, якія трэба пісаць разам:<br>1) (пяці) павярховы;<br>2) (яблычна) бярозавы;<br>3) (ультра) гукавы;<br>4) (кісла) горкі;<br>5) (чарна) морскі.<br><br>**Адказ:** 1,3,5 | 1) *пяціпавярховы* → складаны прыметнік, утвораны ад словазлучэння (***пяць паверхаў***), пішацца разам;<br>2) *яблычна-бярозавы* → складаны прыметнік, утвораны ад двух раўнапраўных прыметнікаў, паміж якімі можна ўставіць злучнік ***і*** (***яблычны*** і ***бярозавы***), пішацца праз злучок;<br>3) *ультрагукавы* → складаны прыметнік з першай іншамоўнай часткай ***ультра-*** пішацца разам;<br>4) *кісла-горкі* → складаны прыметнік, які абазначае асаблівасці смаку, пішацца праз злучок;<br>5) *чарнаморскі* → складаны прыметнік, утвораны ад словазлучэння (***Чорнае мора***), пішацца разам | Марфалогія і арфаграфія. Утварэнне і правапіс складаных прыметнікаў | Беларуская мова : вучэб. дапам. для 6-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 54.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 10-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 20 |
| **А11.** Адзначце прыклады, у якіх лікі правільна запісаны словамі:<br>1) $\frac{4}{9}$ – чатыры дзявятых;<br>2) 30 – трыццаць;<br>3) 60 – шэсцьдзясят;<br>4) 800 – восемьсот;<br>5) 200 – дзвесьце. | 1) *чатыры дзявятыя* → у дробавым лічэбніку з першай часткай *чатыры* другая частка ўжываецца ў форме назоўнага склону множнага ліку – *дзявятыя*;<br>2) *трыццаць* → колькасны лічэбнік напісаны правільна;<br>3) *шэсцьдзясят* → колькасны лічэбнік напісаны правільна; | Марфалогія і арфаграфія. Скланенне і правапіс колькасных і парадкавых лічэбнікаў | Беларуская мова : вучэб. дапам. для 6-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 57–60, 63.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 10-га кл. устаноў агул. сярэд. |

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| **Адказ:** 2,3 | 4) *восемсот* → у колькасным лічэбніку *восемсот* мяккі знак не пішацца;<br>5) *дзвесце* → у колькасным лічэбніку *дзвесце* мяккі знак не пішацца | | адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 29 |
| **А12.** Адзначце прыклады, у якіх выдзеленыя дзеясловы правільна запісаны ў форме 2-й асобы адзіночнага ліку цяперашняга ці будучага простага часу:<br>1) ***нанізаць*** – наніжэш;<br>2) ***трэніравацца*** – трэніруешся;<br>3) ***засяляць*** – засяляеш;<br>4) ***абнадзеіць*** – абнадзеіш;<br>5) ***пад’есці*** – пад’ясі.<br><br>**Адказ:** 2,3,4,5 | 1) ***нанізаць*** – *нані́ж**аш*** → дзеяслоў I спражэння закончанага трывання ў форме 2-й асобы адзіночнага ліку будучага простага часу пасля асновы на зацвярдзелы зычны гук не пад націскам мае канчатак **-*аш***;<br>2) ***трэніравацца*** – *трэніру**еш**ся* → дзеяслоў I спражэння незакончанага трывання ў форме 2-й асобы адзіночнага ліку цяперашняга часу пасля асновы на мяккі зычны гук (<u>*трэніру*[**ў̆**э]</u>*шся*) мае канчатак **-*еш***;<br>3) ***засяляць*** – *засяля**еш*** → дзеяслоў I спражэння незакончанага трывання ў форме 2-й асобы адзіночнага ліку цяперашняга часу пасля асновы на мяккі зычны гук (<u>*засяля*[**й̆**</u>э]*ш*) мае канчатак **-*еш***;<br>4) ***абнадзеіць*** – *абнадзе**іш*** → дзеяслоў II спражэння закончанага трывання ў форме 2-й асобы адзіночнага ліку будучага простага часу пасля асновы на мяккі зычны гук (<u>*абнадзе*[**й̆**</u>і]*ш*) мае канчатак **-*іш***;<br>5) ***пад’есці*** – *пад’ясі* → разнаспрагальны дзеяслоў закончанага трывання ***пад’есці*** ў форме 2-й асобы адзіночнага ліку будучага простага часу пасля асновы на мяккі зычны гук мае канчатак **-*і*** | Марфалогія і арфаграфія. Трыванне дзеяслова. Канчаткі дзеясловаў I і II спражэнняў, іх правапіс. Разнаспрагальныя дзеясловы | Беларуская мова : вучэб. дапам. для 5-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання : у 2 ч. / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2019. – Ч. 1. – § 10.<br>Валочка, Г. М. Беларуская мова : вучэб. дапам. для 7-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка, В. У. Зелянко, С. А. Язерская. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 13, 17, 18.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 10-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 31 |

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў.<br>Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| **А13.** Адзначце прыклады, у якіх выдзеленыя словы трэба пісаць разам:<br>1) (***па***) ***асенняму*** холадна;<br>2) назбіралі (***за***) ***многа***;<br>3) будаваць (***у***) ***чатырох***;<br>4) (***гэтак***) ***сама*** расказаць;<br>5) злавіць (***на***) ***бягу***.<br><br>**Адказ:** 2,3,4 | 1) ***па-асенняму*** *холадна* → прыслоўе, якое мае прыстаўку ***па-*** і заканчваецца на ***-яму***, пішацца праз злучок;<br>2) *назбіралі* ***замнога*** → прыслоўе, утворанае шляхам спалучэння прыназоўніка ***за*** з прыслоўем, пішацца разам;<br>3) *будаваць* ***учатырох*** → прыслоўе, утворанае шляхам спалучэння прыназоўніка ***у*** з лічэбнікам, пішацца разам;<br>4) ***гэтаксама*** *расказаць* → прыслоўе з другой часткай -***сама*** пішацца разам;<br>5) *злавіць* ***на бягу*** → блізкае да прыслоўя па значэнні і функцыі спалучэнне назоўніка з прыназоўнікам пішацца асобна | Марфалогія і арфаграфія. Правапіс прыслоўяў і спалучэнняў слоў, блізкіх да прыслоўяў | Валочка, Г. М. Беларуская мова : вучэб. дапам. для 7-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка, В. У. Зелянко, С. А. Язерская. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 38–40.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 10-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 20 |
| **А14.** Адзначце прыклады, у якіх ***не*** з выдзеленымі словамі трэба пісаць разам:<br>1) (***не***) ***адчуваючы*** холаду;<br>2) (***не***) ***абсяжны*** прастор;<br>3) (***не***) ***чакаць*** цягніка;<br>4) (***не***) ***кароткі***, а доўгі дзень;<br>5) (***не***) ***палітыя*** кветкі.<br><br>**Адказ:** 2,5 | 1) ***не адчуваючы*** *холаду* → ***не*** з дзеепрыслоўем пішацца асобна;<br>2) ***неабсяжны*** *прастор* → ***не-*** – прыстаўка, без якой слова ***неабсяжны*** не ўжываецца;<br>3) ***не чакаць*** *цягніка* → ***не*** з дзеясловам пішацца асобна;<br>4) ***не кароткі***, *а доўгі дзень* → ***не*** з прыметнікам пішацца асобна, бо ёсць супрацьпастаўленне;<br>5) ***непалітыя*** *кветкі* → ***не*** з поўным дзеепрыметнікам, пры якім няма залежнага слова, пішацца разам | Марфалогія і арфаграфія. Правапіс часціцы ***не*** з рознымі часцінамі мовы | Беларуская мова : вучэб. дапам. для 6-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 55.<br>Валочка, Г. М. Беларуская мова : вучэб. дапам. для 7-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка, В. У. Зелянко, С. А. Язерская. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 8, 27, 29, 52.<br>Бадзевіч, З. І. Беларуская мова : вучэб. дапам. для 8-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / З. І. Бадзевіч, І. М. Саматыя. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 4 |
| **А15.** Адзначце сказы, у якіх правільна ўжыта падкрэсленая часціца ***не***:<br>1) Якіх толькі цукерак ***не*** вырабляюць на «Камунарцы»!<br>2) ***Не*** разу не прымаў такога рашэння, супраць | 1) *Якіх толькі цукерак* ***не*** *вырабляюць на «Камунарцы»!* → у сказе пытальна-клічнага тыпу часціца ***не***, якая мае сцвярджальны сэнс, ужыта правільна;<br>2) ***Ні*** *разу не прымаў такога рашэння, супраць* | Марфалогія і арфаграфія. Часціцы ***не*** і ***ні***, іх ужыванне і правапіс | Валочка, Г. М. Беларуская мова : вучэб. дапам. для 7-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка, В. У. Зелянко, С. А. Язерская. – Мінск : Нац. ін-т |

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| якога б было маё сумленне.<br>3) Люблю неба, у якім ***<u>не</u>*** хмурынкі.<br>4) Плесці кошыкі навучыў мяне ***<u>не</u>*** хто іншы, як дзядуля.<br>5) Новых сяброў нажывай, але старых ***<u>не</u>*** забывай.<br><br>**Адказ:** 1,4,5 | *якога б было маё сумленне.* → у спалучэнні ***ні разу*** са значэннем *‘ніколі’* ўжываецца часціца ***ні***;<br>3) *Люблю неба, у якім **ні** хмурынкі.* → для надання адмоўнага значэння сказу без дзейніка ўжываецца часціца ***ні***, якая стаіць пры назоўніку ў форме роднага склону ***хмурынкі***;<br>4) *Плесці кошыкі навучыў мяне **не** хто іншы, як дзядуля.* → у сказе, які перадае сцвярджэнне, у спалучэнні са злучнікам ***як*** (***не хто іншы, як***) часціца ***не*** ўжыта правільна;<br>5) *Новых сяброў нажывай, але старых **не** забывай.* → часціца ***не***, якая стаіць пры выказніку і надае адмоўнае значэнне частцы сказа, ужыта правільна | | адукацыі, 2020. – § 51.<br>Бадзевіч, З. І. Беларуская мова : вучэб. дапам. для 8-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / З. І. Бадзевіч, І. М. Саматыя. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – практ. 27 |
| **А16.** Адзначце сінтаксічныя канструкцыі, якія адпавядаюць нормам беларускай літаратурнай мовы:<br>1) пайсці ў грыбы;<br>2) распытваць пра сваякоў;<br>3) уважлівы да людзей;<br>4) гуляць па вуліцам;<br>5) смяяцца над лайдаком.<br><br>**Адказ:** 1,2,3 | 1) *пайсці ў грыбы* → пры дзеяслове са значэннем руху ***пайсці*** (у значэнні ‘*збіраць*’) назоўнік ***грыбы*** ўжываецца ў форме вінавальнага склону з прыназоўнікам ***у***;<br>2) *распытваць пра сваякоў* → пры дзеяслове са значэннем маўлення ***распытваць*** назоўнік ужываецца ў форме вінавальнага склону з прыназоўнікам ***пра***;<br>3) *уважлівы да людзей* → характэрная для беларускай мовы сінтаксічная канструкцыя;<br>4) *гуляць па вуліцах* → пры дзеяслове са значэннем дзеяння ***гуляць*** назоўнік ужываецца ў форме меснага склону з прыназоўнікам ***па***;<br>5) *смяяцца з лайдака* → пры дзеяслове ***смяяцца*** назоўнік ужываецца ў форме роднага склону з прыназоўнікам ***з*** | Сінтаксіс і пунктуацыя. Словазлучэнне як сінтаксічная адзінка. Асаблівасці кіравання ў беларускай мове (у параўнанні з рускай) | Бадзевіч, З. І. Беларуская мова : вучэб. дапам. для 8-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / З. І. Бадзевіч, І. М. Саматыя. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – С. 55, 56.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 10-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання : з электронным дадаткам для павыш. узроўню / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 33.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 11-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2021. – § 3 |
| **А17.** Адзначце сказы, у якіх выдзеленае | 1) *Калісьці млын быў у кожнай вёсцы.* → (*якой?*) | Сінтаксіс і | Беларуская мова : вучэб. дапам. |

| **Заданне.<br>Адказ** | **Разбор задання** | **Раздзел праграмы ўступных іспытаў.<br>Элемент зместу** | **Вучэбны дапаможнік** |
|---|---|---|---|
| (выдзеленыя) слова (словы) – ***азначэнне***:<br>1) Калісьці млын быў у ***кожнай*** вёсцы.<br>2) ***Дзяжурны*** добра выконваў свае абавязкі.<br>3) Я з задавальненнем наведала вечарыну, ***прысвечаную творчасці Яўгеніі Янішчыц***.<br>4) Людзі ў нас ***працавітыя***.<br>5) Пасля знаёмства з цікавай кнігай у мяне заўжды ўзнікае жаданне ***падзяліцца*** з кім-небудзь прачытаным.<br><br>**Адказ:** 1,3,5 | ***кожнай*** – дапасаванае азначэнне, выражанае азначальным займеннікам;<br>2) *Дзяжурны добра выконваў свае абавязкі.* → (*хто?*) ***дзяжурны*** – дзейнік, выражаны прыметнікам у значэнні назоўніка;<br>3) *Я з задавальненнем наведала вечарыну, прысвечаную творчасці Яўгеніі Янішчыц.* → (*якую?*) ***прысвечаную творчасці Яўгеніі Янішчыц*** – дапасаванае азначэнне, выражанае дзеепрыметнікавым зваротам;<br>4) *Людзі ў нас працавітыя.* → (*якія яны?*) ***працавітыя*** – састаўны іменны выказнік, у якім дзеяслоў-звязка адсутнічае (нулявая звязка), іменная частка выражана прыметнікам ***працавітыя***;<br>5) *Пасля знаёмства з цікавай кнігай у мяне заўжды ўзнікае жаданне падзяліцца з кім-небудзь прачытаным.* → (*якое?*) ***падзяліцца*** – недапасаванае азначэнне, выражанае інфінітывам | пунктуацыя.<br>Дзейнік і выказнік, спосабы іх выражэння.<br>Даданыя члены сказа. Спосабы выражэння даданых членаў сказа | для 5-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання : у 2 ч. / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2019. – Ч. 1. – § 22.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 6-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 70.<br>Валочка, Г. М. Беларуская мова : вучэб. дапам. для 7-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка, В. У. Зелянко, С. А. Язерская. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 9, 22, 54.<br>Бадзевіч, З. І. Беларуская мова : вучэб. дапам. для 8-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / З. І. Бадзевіч, І. М. Саматыя. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 15, 16, 18, 21.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 11-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2021. – § 7; С. 33 |

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| **А18.** Адзначце сцверджанні, якія адпавядаюць прыведзенаму сказу:<br>*Павуцінка бабінага лета, не спяшайся ўдалеч адлятаць.*<br>1) двухсастаўны сказ;<br>2) галоўныя члены сказа: дзейнік, выражаны назоўнікам; выказнік, выражаны інфінітывам;<br>3) галоўны член сказа – дзейнік, выражаны назоўнікам;<br>4) аднасастаўны сказ;<br>5) галоўны член сказа – выказнік, выражаны дзеясловам загаднага ладу.<br><br>**Адказ:** 4,5 | *Павуцінка бабінага лета, не спяшайся ўдалеч адлятаць.* → сказ аднасастаўны; галоўны член сказа – выказнік, выражаны дзеясловам загаднага ладу ***не спяшайся*** | Сінтаксіс і пунктуацыя. Двухсастаўныя сказы. Аднасастаўныя сказы, іх будова | Бадзевіч, З. І. Беларуская мова : вучэб. дапам. для 8-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / З. І. Бадзевіч, І. М. Саматыя. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 25–29 |
| **А19.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску ***абавязкова*** ставіцца працяжнік:<br>1) Любіць чытаць __ не мець суму ў любой дарозе.<br>2) Лось __ сапраўдны лясны велікан.<br>3) Беларусь, ты __ край белых буслоў.<br>4) Ландышы __ лясоў аздоба.<br>5) Беларуская верашчака __ пальчыкі абліжаш!<br><br>**Адказ:** 1,2,5 | 1) *Любіць чытаць* **–** *не мець суму ў любой дарозе.* → паміж дзейнікам і выказнікам, выражанымі інфінітывамі, ***абавязкова*** ставіцца працяжнік і тады, калі пры выказніку-інфінітыве стаіць адмоўная часціца ***не***;<br>2) *Лось* **–** *сапраўдны лясны велікан.* → паміж дзейнікам і выказнікам, выражанымі назоўнікамі ў форме назоўнага склону, ***абавязкова*** ставіцца працяжнік;<br>3) *Беларусь, ты край белых буслоў.* → паміж дзейнікам, выражаным асабовым займеннікам, і выказнікам, выражаным назоўнікам у форме назоўнага склону, працяжнік ***не ставіцца***;<br>4) *Ландышы лясоў аздоба.* → паміж дзейнікам і выказнікам, выражанымі назоўнікамі ў форме назоўнага склону, ёсць недапасаваны да выказніка дадзены член сказа, таму працяжнік ***не ставіцца***;<br>5) *Беларуская верашчака* **–** *пальчыкі абліжаш!* → паміж дзейнікам, выражаным назоўнікам у форме назоўнага склону, і выказнікам, выражаным фразеалагізмам, ***абавязкова*** | Сінтаксіс і пунктуацыя. Працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам | Беларуская мова : вучэб. дапам. для 5-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання : у 2 ч. / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2019. – Ч. 1. – § 20.<br>Бадзевіч, З. І. Беларуская мова : вучэб. дапам. для 8-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / З. І. Бадзевіч, І. М. Саматыя. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 20 |

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | ставіцца працяжнік | | |
| **А20.** Адзначце сказы, у якіх няма парушэння пунктуацыйных нормаў:<br>1) Сонейка ў творах Васіля Зуёнка то гарэзлівае, то руплівае.<br>2) Ад кашлю добра дапамагае адвар з маліннiку, ці з ліпавага цвету.<br>3) Зубры ахвотна ядуць кару асін, і елак, і любяць маладыя галінкі розных дрэў.<br>4) Летам я прачынаюся ні свет, ні зара.<br>5) Зноў крык жураваў над туманным абшарам, над паркам, над рэчкай тужліва звініць.<br><br>**Адказ:** 1,5 | 1) *Сонейка ў творах Васіля Зуёнка то гарэзлівае, то руплівае.* → у сказе няма парушэння пунктуацыйных нормаў: паміж аднароднымі выказнікамі, звязанымі пры дапамозе паўторнага размеркавальнага злучніка ***то – то***, ставіцца коска;<br>2) *Ад кашлю добра дапамагае адвар з маліннiку ці з ліпавага цвету.* → паміж аднароднымі азначэннямі, звязанымі адзіночным размеркавальным злучнікам ***ці***, коска не ставіцца;<br>3) *Зубры ахвотна ядуць кару асін і елак і любяць маладыя галінкі розных дрэў.* → паміж аднароднымі азначэннямі і аднароднымі выказнікамі, звязанымі адзіночным спалучальным злучнікам ***і***, коска не ставіцца;<br>4) *Летам я прачынаюся ні свет ні зара.* → словы-кампаненты ў складзе фразеалагізма (*ні свет ні зара*) коскай не раздзяляюцца;<br>5) *Зноў крык жураваў над туманным абшарам, над паркам, над рэчкай тужліва звініць.* → у сказе няма парушэння пунктуацыйных нормаў: паміж аднароднымі акалічнасцямі, звязанымі бяззлучнікавай сувяззю, ставяцца коскі | Сінтаксіс і пунктуацыя. Знакі прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі (з абагульняльнымі словамі і без іх) | Беларуская мова : вучэб. дапам. для 5-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання : у 2 ч. / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2019. – Ч. 1. – § 26, 27.<br>Бадзевіч, З. І. Беларуская мова : вучэб. дапам. для 8-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / З. І. Бадзевіч, І. М. Саматыя. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 31–34.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 9-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2019. – практ. 41.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 11-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2021. – § 5 |

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў.<br>Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| **А21.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску (пропускаў) трэба паставіць коску (коскі):<br>1) Вузенькая__ што пасачка__ сцежка вывела мяне на сунічную паляну.<br>2) Іржышча__ быццам рыжы вожык.<br>3) Паважна__ нібыта свацц累__ разложыстая ліпа расселася пры хаце.<br>4) Між магутных ствалоў высокіх дрэў зіхаціць сіняе__ быццам сапфір__ возера.<br>5) Пасля дажджу грыбы растуць__ як на дражджах.<br><br>**Адказ:** 1,3,4 | 1) *Вузенькая**,** што пасачка**,** сцежка вывела мяне на сунічную паляну.* → параўнальны зварот выдзяляецца коскамі;<br>2) *Іржышча быццам рыжы вожык.* → паміж дзейнікам і выказнікам коска не ставіцца;<br>3) *Паважна**,** нібыта сваццця**,** разложыстая ліпа расселася пры хаце.* → параўнальны зварот выдзяляецца коскамі;<br>4) *Між магутных ствалоў высокіх дрэў зіхаціць сіняе**,** быццам сапфір**,** возера.* → параўнальны зварот выдзяляецца коскамі;<br>5) *Пасля дажджу грыбы растуць як на дражджах.* → фразеалагізм коскай не аддзяляецца | Сінтаксіс і пунктуацыя.<br>Знакі прыпынку ў сказах з параўнальнымі зваротамі | Бадзевіч, З. І. Беларуская мова : вучэб. дапам. для 8-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / З. І. Бадзевіч, І. М. Саматыя. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 45, 46.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 11-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2021. – § 10 |
| **А22.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску (пропускаў) трэба паставіць коску (коскі):<br>1) Сплеценыя з лазы__ вырабы бытуюць у нас здаўна.<br>2) Ліпеньскае сонейка святло і цеплыню дорыць__ не шкадуючы.<br>3) Крыжадзюб__ ці інакш паўночны пугач__ выводзіць сваіх дзяцей зімой.<br>4) Мядзведзь__ апрача мёду__ любіць паласавацца ягадамі.<br>5) Абраўшы адну дарогу__ не спяшайся збочваць на другую.<br><br>**Адказ:** 3,4,5 | 1) *Сплеценыя з лазы вырабы бытуюць у нас здаўна.* → дапасаванае азначэнне, якое выражана дзеепрыметнікавым зваротам, стаіць перад паяснёным назоўнікам (***вырабы***) і не мае дадатковага акалічнаснага значэння прычыны ці ўступкі, не аддзяляецца коскай;<br>2) *Ліпеньскае сонейка святло і цеплыню дорыць не шкадуючы.* → выражаная адзіночным дзеепрыслоўем акалічнасць, якая стаіць у канцы сказа і сваім значэннем набліжаецца да прыслоўя спосабу дзеяння (адказвае на пытанне *як?*), не аддзяляецца коскай;<br>3) *Крыжадзюб**,** ці інакш паўночны пугач**,** выводзіць сваіх дзяцей зімой.* → адасоблены прыдатак, які дае прадмету другую назву і пры якім ёсць злучнік ***ці***, выдзяляецца коскамі;<br>4) *Мядзведзь**,** апрача мёду**,** любіць паласавацца ягадамі.* → адасобленае дапаўненне з прыназоўнікам ***апрача*** выдзяляецца коскамі;<br>5) *Абраўшы адну дарогу**,** не спяшайся збочваць на другую.* → адасобленая акалічнасць, выражаная дзеепрыслоўным зваротам, | Сінтаксіс і пунктуацыя.<br>Знакі прыпынку ў сказах з адасобленымі членамі | Валочка, Г. М. Беларуская мова : вучэб. дапам. для 7-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка, В. У. Зелянко, С. А. Язерская. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 22, 30.<br>Бадзевіч, З. І. Беларуская мова : вучэб. дапам. для 8-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / З. І. Бадзевіч, І. М. Саматыя. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 39–43.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 11-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2021. – § 7 |

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў.<br>Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | аддзяляецца коскай | | |
| **А23.** Адзначце сказы, у якіх няма парушэння пунктуацыйных нормаў:<br>1) Бруснічны сок, можа, добра наталіць смагу і палепшыць апетыт.<br>2) З кары ляшчыны, як вядома, атрымліваюць фарбавальныя і дубільныя рэчывы.<br>3) У калядную ноч, нават, сняжынкі кружацца-вальсуюць.<br>4) У гліняным посудзе, і праўда, малако будзе свежым тры-чатыры дні.<br>5) Кветкі дарэчы мацней пахнуць перад дажджом.<br><br>**Адказ:** 2,4 | 1) *Бруснічны сок можа добра наталіць смагу і палепшыць апетыт.* → дапаможны дзеяслоў ***можа*** ў састаўным дзеяслоўным выказніку ***можа наталіць*** коскамі выдзяляць не трэба;<br>2) *З кары ляшчыны, як вядома, атрымліваюць фарбавальныя і дубільныя рэчывы.* → у сказе няма парушэння пунктуацыйных нормаў: сказ ***як вядома***, які граматычна не звязаны з іншымі словамі ў сказе, указвае на большую ступень упэўненасці ў паведамленні, з'яўляецца пабочным; пабочны сказ выдзяляецца коскамі;<br>3) *У калядную ноч нават сняжынкі кружацца-вальсуюць.* → часціцу ***нават*** коскамі выдзяляць не трэба;<br>4) *У гліняным посудзе, і праўда, малако будзе свежым тры-чатыры дні.* → у сказе няма парушэння пунктуацыйных нормаў: слова ***праўда*** – пабочнае, бо яно граматычна не звязана з іншымі словамі ў сказе, не з'яўляецца членам сказа і ўказвае на большую ступень упэўненасці ў выказванні; пабочнае слова выдзяляецца коскамі разам з далучальным злучнікам ***і***, які адносіцца да яго;<br>5) *Кветкі**,** дарэчы**,** мацней пахнуць перад дажджом.* → слова ***дарэчы*** – пабочнае, бо яно граматычна не звязана з іншымі словамі ў сказе, не з'яўляецца членам сказа і ўказвае на сувязь думак; пабочнае слова трэба выдзеліць коскамі | Сінтаксіс і пунктуацыя.<br>Знакі прыпынку ў сказах з пабочнымі канструкцыямі | Бадзевіч, З. І. Беларуская мова : вучэб. дапам. для 8-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / З. І. Бадзевіч, І. М. Саматыя. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 38.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 11-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2021. – § 9 |
| **А24.** Адзначце складаназлучаныя сказы, паміж часткамі якіх ***не трэба*** ставіць знак прыпынку:<br>1) Змоўк шпачыны звонкі спеў а ў цяністым садзе штрыфель сонечны паспеў.<br>2) Яшчэ дзень-два і пачнецца жніво. | 1) *Змоўк шпачыны звонкі спеў**,** а ў цяністым садзе штрыфель сонечны паспеў.* → паміж часткамі складаназлучанага сказа з супастаўляльнымі сэнсавымі адносінамі перад супраціўным злучнікам ***а*** трэба паставіць | Сінтаксіс і пунктуацыя.<br>Знакі прыпынку паміж часткамі ў складаназлучаных сказах | Беларуская мова : вучэб. дапам. для 9-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2019. – § 10– |

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў.<br>Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| 3) Бязвоблачна і цёпла.<br>4) То ў белым вэлюме вішні стаяць то рубіны на іх зіхацяць.<br>5) Дзесьці малінаўка спявае і стукае жаўна.<br><br>**Адказ:** 3,5 | коску;<br>2) *Яшчэ дзень-два* **–** *і пачнецца жніво.* → паміж часткамі складаназлучанага сказа, якія паказваюць на хуткую змену падзей і звязаны спалучальным злучнікам ***і***, трэба паставіць працяжнік;<br>3) *Бязвоблачна і цёпла.* → паміж часткамі складаназлучанага сказа, якія з’яўляюцца безасабовымі сказамі, перад адзіночным спалучальным злучнікам ***і*** знак прыпынку ставіць не трэба;<br>4) *То ў белым вэлюме вішні стаяць***,** *то рубіны на іх зіхацяць.* → паміж часткамі складаназлучанага сказа з размеркавальнымі сэнсавымі адносінамі, звязанымі паўторным размеркавальным злучнікам ***то*** – ***то***, трэба паставіць коску;<br>5) *Дзесьці малінаўка спявае і стукае жаўна.* → паміж часткамі складаназлучанага сказа са спалучальнымі сэнсавымі адносінамі перад адзіночным спалучальным злучнікам ***і*** знак прыпынку ставіць не трэба, бо ў першай частцы ёсць агульная для абедзвюх частак акалічнасць ***Дзесьці*** |  | 14.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 11-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2021. – § 11 |
| **А25.** Адзначце складаназалежныя сказы, у якіх на месцы пропуску (пропускаў) ***не трэба*** ставіць знак (знакі) прыпынку:<br>1) Люблю пару, калі суніцы даспяваюць у лясах__ і калі на шыпшыне звіняць пчаліныя гуслі.<br>2) Падбярозавікі__ якія растуць на балоце__ адрозніваюцца ад лясных сваёй афарбоўкай.<br>3) Адплывае светлым сном дзяцінства і не кажа__ куды.<br>4) Стаіць і слухае пралеска__ як ціха дыхае зямля.<br>5) Не раз прыкмячаў, што__ калі салавей праспяваў усю ноч, дзень будзе сонечны. | 1) *Люблю пару, калі суніцы даспяваюць у лясах і калі на шыпшыне звіняць пчаліныя гуслі.* → складаназалежны сказ з дзвюма даданымі часткамі, якія паясняюць у галоўнай дапаўненне ***пару***, адказваюць на адно і тое ж пытанне *якую?* і з’яўляюцца аднароднымі; паміж аднароднымі даданымі часткамі, звязанымі адзіночным спалучальным злучнікам ***і***, знак прыпынку ставіць не трэба;<br>2) *Падбярозавікі***,** *якія растуць на балоце***,** *адрозніваюцца ад лясных сваёй афарбоўкай.* → складаназалежны сказ, у якім даданую частку, што стаіць у сярэдзіне | Сінтаксіс і пунктуацыя.<br>Знакі прыпынку паміж часткамі ў складаназалежных сказах | Беларуская мова : вучэб. дапам. для 9-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2019. – § 15–24.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 11-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2021. – § 12 |

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| **Адказ:** 1,3 | галоўнай і звязана з ёй пры дапамозе злучальнага слова ***якія***, трэба выдзеліць коскамі;<br>3) *Адплывае светлым сном дзяцінства і не кажа куды.* → складаназалежны сказ, у якім дадзеную частку, што стаіць пасля галоўнай і выражана адным словам, коскай аддзяляць не трэба;<br>4) *Стаіць і слухае пралеска**,** як ціха дыхае зямля.* → складаназалежны сказ, у якім трэба аддзяліць коскай дадзеную частку, што стаіць пасля галоўнай і звязана з ёй пры дапамозе падпарадкавальнага злучніка ***як***;<br>5) *Не раз прыкмячаў, што**,** калі салавей праспяваў усю ноч, дзень будзе сонечны.* → складаназалежны сказ з дзвюма дадзенымі часткамі, дзе паміж падпарадкавальнымі злучнікамі ***што*** і ***калі***, якія стаяць побач, трэба паставіць коску, бо няма другой часткі ***то*** (***дык***) парнага злучніка ***калі*** – ***то*** (***калі*** – ***дык***) | | |
| **А26.** Адзначце бяззлучнікавыя складаныя сказы, паміж часткамі якіх трэба паставіць працяжнік:<br>1) На Каляды снег ідзе будзе добры ўраджай арэхаў.<br>2) Матылёк зноў кружыць над лагчынай зноў на кветкі па́дае пчала.<br>3) Кнігаўка лічыцца карыснай птушкай яна знішчае шкодных насякомых.<br>4) Сонейка выплыла з-за хмар цяплей не стала.<br>5) У асеннім небе дзіўная карціна ў развітальным танцы кружаць журавы.<br><br>**Адказ:** 1,4 | 1) *На Каляды снег ідзе **–** будзе добры ўраджай арэхаў.* → паміж дзвюма часткамі бяззлучнікавага складанага сказа трэба паставіць працяжнік, бо першая частка паказвае на ўмову таго, пра што гаворыцца ў другой; у пачатку першай часткі можна паставіць злучнік ***калі***;<br>2) *Матылёк зноў кружыць над лагчынай**,** зноў на кветкі па́дае пчала.* → паміж дзвюма часткамі бяззлучнікавага складанага сказа трэба паставіць коску, бо ў іх выражаюцца адносіны адначасовасці з'яў; паміж часткамі можна ўставіць спалучальныя злучнікі ***і***, ***ды*** (= ***і***);<br>3) *Кнігаўка лічыцца карыснай птушкай**:** яна знішчае шкодных насякомых.* → паміж дзвюма | Сінтаксіс і пунктуацыя. Знакі прыпынку паміж часткамі ў бяззлучнікавых складаных сказах | Беларуская мова : вучэб. дапам. для 9-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2019. – § 25–29.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 11-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2021. – § 13 |

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | часткамі бяззлучнікавага складанага сказа трэба паставіць двукроп'е, бо ў другой частцы ўказваецца прычына таго, пра што гаворыцца ў першай; паміж часткамі можна ўставіць злучнікі ***бо***, ***таму што***;<br>4) *Сонейка выплыла з-за хмар* **–** *цяплей не стала.* → паміж дзвюма часткамі бяззлучнікавага складанага сказа трэба паставіць працяжнік, бо іх змест супрацьпастаўляецца; паміж часткамі можна ўставіць супраціўны злучнік ***але***;<br>5) *У асеннім небе дзіўная карціна**:** у развітальным танцы кружаць журавы.* → паміж дзвюма часткамі бяззлучнікавага складанага сказа трэба паставіць двукроп'е, бо другая частка паясняе, удакладняе змест першай; паміж часткамі можна ўставіць словы ***а іменна*** | | |
| **А27.** Адзначце нумары пропускаў, на месцы якіх у складаным сказе з рознымі відамі сувязі частак трэба паставіць коску:<br><br>*Тых* **1)**__ *хто любіць птушыныя спевы* **2)**__ *і хто вясновымі раніцамі прыслухоўваецца да кожнага голасу* **3)**__ *ў першую чаргу парадуюць, безумоўна, шпакі* **4)**__ *яны, маючы здольнасць перадражніваць розных птушак, то голасам дразда-белабровіка ці івалгі заспяваюць, то зяблікам, то галкай або цецеруком* **5)**__ *а найбольш здольныя з іх могуць прадэманстраваць галасы 12 відаў птушак.*<br><br>**Адказ:** 1,3,5 | **I** [1]*Тых**,*** [2]*хто любіць птушыныя спевы і* [3]*хто вясновымі раніцамі прыслухоўваецца да кожнага голасу**,*** [1]*у першую чаргу парадуюць, безумоўна, шпакі**:*** **II** [4]*яны, маючы здольнасць перадражніваць розных птушак, то голасам дразда-белабровіка ці івалгі заспяваюць, то зяблікам, то галкай або цецеруком**,** а* [5]*найбольш здольныя з іх могуць прадэманстраваць галасы 12 відаў птушак.* → нумары пропускаў, на месцы якіх у складаным сказе з рознымі відамі сувязі частак трэба паставіць коску, – **1, 3, 5**:<br>1) у сэнсавай частцы **I** аднародныя даданыя часткі **2** і **3**, якія стаяць у сярэдзіне галоўнай часткі **1** і звязаны з ёй злучальным словам ***хто***, трэба з двух бакоў выдзеліць коскамі;<br>2) у сэнсавай частцы **I** не трэба ставіць коску паміж аднароднымі даданымі часкамі **2** і **3**, якія звязаны паміж сабой пры дапамозе | Сінтаксіс і пунктуацыя. Знакі прыпынку паміж часткамі ў складаных сказах з рознымі відамі сувязі частак | Беларуская мова : вучэб. дапам. для 9-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2019. – § 30, 31.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 11-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2021. – § 14 |

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | адзіночнага спалучальнага злучніка ***і***;<br>3) паміж сэнсавымі часткамі **I** і **II**, якія аб'яднаны пры дапамозе бяззлучнікавай сувязі, трэба паставіць двукроп'е, бо ў частцы **II** указваецца прычына таго, пра што гаворыцца ў частцы **I**; паміж часткамі можна ўставіць злучнікі ***бо***, ***таму што***;<br>4) у сэнсавай частцы **II** паміж часткамі **4** і **5** з супастаўляльнымі сэнсавымі адносінамі перад супраціўным злучнікам ***а*** трэба паставіць коску | | |
| **А28.** Адзначце прапушчаныя ў сказе з простай мовай знакі прыпынку:<br><br>*«Ушацкая група ўключае ў сябе каля 40 азёр – пачаў наша падарожжа экскурсавод і дадаў: Амаль кожнае з іх мае свае таямніцы і загадкі».*<br><br>1) коска;<br>2) працяжнік;<br>3) кропка;<br>4) двукроп'е;<br>5) пытальнік.<br><br>**Адказ:** 1,2 | *«Ушацкая група ўключае ў сябе каля 40 азёр**,** – пачаў наша падарожжа экскурсавод і дадаў:* **–** *Амаль кожнае з іх мае свае таямніцы і загадкі».* → у сказе з простай мовай прапушчана *коска* і *працяжнік* – знакі прыпынку пад нумарамі **1, 2**:<br>1) перад словамі аўтара, якія стаяць у сярэдзіне простай мовы, ставяцца ***коска*** і працяжнік;<br>2) пасля слоў аўтара з двума дзеясловамі маўлення, адзін з якіх (***пачаў***) адносіцца да першай часткі простай мовы, а другі (***дадаў***) – да другой часткі, ставяцца двукроп'е і ***працяжнік*** | Сінтаксіс і пунктуацыя. Знакі прыпынку ў сказах з простай мовай | Беларуская мова : вучэб. дапам. для 5-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання : у 2 ч. / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2019. – Ч. 1. – § 30.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 9-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2019. – § 32.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 11-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2021. – § 15 |

**Тэкст да заданняў А29, А30, В1–В6**

(1) *Мінск, як і належыць сталіцы, мае свой герб.* (2) *Ён зацверджаны аж 12 студзеня 1591 года.* (3) *Герб нашай сталіцы (без яго мы сабе ўжо не ўяўляем) вельмі прыгожы: на блакітным фоне – Багародзіца на сярэбраным воблаку.* (4) *Перад Багародзіцай укленчылі два анёлы, якія ўзносяць яе ў неба.* (5) *З двух бакоў над галавой Дзевы Марыі **лунаюць** два херувімы з сярэбранымі крыламі.* (6) *Над галавой Багародзіцы, кожнага херувіма і анёла – залатыя німбы.*

(7) *Незвычайна прыгожая легенда пра тое, як Мінску быў дараваны герб з выявай Дзевы Марыі.* (8) *13 жніўня 1500 года жыхары горада заўважылі дзіўнае святло над Свіслаччу, непадалёку ад Траецкага прадмесця.* (9) *Каб (у, ва) ўсім разабрацца, гараджане пабеглі да **ракі**.* (10) *І там яны ўбачылі цуд: хвалі Свіслачы вынеслі на бераг абраз з выявай Прасвятой Дзевы Марыі.* (11) *Як жа абраз патрапіў сюды?*

(12) *Яшчэ ў 989 годзе князь Уладзімір Святаслаunion вывез святыню з візантыйскага горада Херсанеса ў Кіеў.* (13) *У канцы XV стагоддзя ў Кіеў уварваліся*

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| *татары, і адзін з іх адважыўся* ***кінуць*** *абраз у Дняпро.* (14) ***…*** (15) *Так святыня трапіла ў Мінск.* (16) *І так Маці Божая стала заступніцай* ***роднага*** *горада ды ўсіх яго жыхароў.*<br>(17) *Сёння цудадзейны абраз захоўваецца ў кафедральным Свята-Духавым саборы злева ад алтара.* | | | |
| **А29.** Адзначце правільнае сцверджанне ў дачыненні да тэксту:<br>1) тэкст навуковага стылю;<br>2) тэкст мастацкага стылю;<br>3) тэкст публіцыстычнага стылю;<br>4) тэкст гутарковага стылю;<br>5) тэкст афіцыйнага стылю.<br><br>**Адказ:** 3 | тэксту адпавядае сцверджанне пад нумарам **3**: тэкст ***публіцыстычнага стылю***, таму што:<br>1) адрасат тэксту з’яўляецца масавым;<br>2) асноўная задача аўтара тэксту – паведаміць інфармацыю і ўздзейнічаць на думкі чытача, выклікаючы пэўны водгук;<br>3) матэрыял тэксту пададзены лаканічна, даходліва; характэрныя яму ацэначнасць і вобразнасць тлумачацца тым, што аўтар, перадаючы інфармацыю, выражае да яе сваё стаўленне;<br>4) тэксту характэрны інфармацыйная насычанасць, канкрэтнасць;<br>5) у тэксце ёсць моўна-выяўленчыя сродкі, характэрныя для публіцыстычных жанраў: метафары (*хвалі Свіслачы вынеслі абраз, Маці Божая стала заступніцай*), эпітэты (з *сярэбранымі* крыламі, *залатыя* німбы, *дзіўнае* святло, *цудадзейны* абраз); пабочныя і ўстаўныя канструкцыі, паўторы і інш. | Маўленне. Тэкст. Стылістыка. Функцыянальныя стылі маўлення | Беларуская мова : вучэб. дапам. для 5-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання : у 2 ч. / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2019. – Ч. 1. – § 3, 4.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 6-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 7–9.<br>Валочка, Г. М. Беларуская мова : вучэб. дапам. для 7-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка, В. У. Зелянко, С. А. Язерская. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 6.<br>Бадзевіч, З. І. Беларуская мова : вучэб. дапам. для 8-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / З. І. Бадзевіч, І. М. Саматыя. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 5.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 9-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2019. – § 7.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 11-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, |

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | | | 2021. – § 2 |
| **А30.** Адзначце сказ, у якім няма парушэння лексічных нормаў і які павінен быць ужыты ў тэксце пад нумарам ***14***:<br>1) *І тут шмат хто на ўласныя вочы змог убачыць дзіва: абраз паплыў не па цячэнні магутнай ракі, а насупраць яго.*<br>2) *І тут шмат хто на ўласныя вочы змог убачыць чуда: абраз паплыў не па цячэнні магутнай ракі, а супраць яго.*<br>3) *І тут шмат хто на ўласныя вочы змог убачыць дзіва: абраз паплыў не па цячэнні магутнай прыроднай ракі, а супраць яго.*<br>4) *І тут шмат хто на ўласныя вочы змог убачыць дзіва: абраз паплыў не па цячэнні магутнай ракі, а супраць яго.*<br>5) *І тут шмат хто на ўласніцкія вочы змог убачыць дзіва: абраз паплыў не па цячэнні магутнай ракі, а супраць яго.*<br><br>**Адказ:** 4 | 1) у сказе парушана лексічная норма: з блізкіх па значэнні слоў ***насупраць*** і ***супраць*** толькі слова ***супраць*** у адпаведнасці са сваім значэннем можа быць ужыта, калі гаворка ідзе пра ***цячэнне ракі***;<br>2) у сказе парушана лексічная норма: слова ***чуда*** ў беларускай мове няма;<br>3) у сказе парушана лексічная норма: слова ***прыроднай*** збыткоўнае (плеаназм), бо ***рака*** – гэта ***<u>прыродны</u> вадаём***;<br>4) у сказе няма парушэння лексічных нормаў;<br>5) у сказе парушана лексічная норма: словы ***ўласныя*** і ***ўласніцкія*** – паронімы, з якіх толькі слова ***ўласныя*** ў адпаведнасці са сваім значэннем можа спалучацца са словам (***на***) ***вочы*** | Маўленне. Тэкст. Стылістыка. Нормы сучаснай беларускай літаратурнай мовы | Беларуская мова : вучэб. дапам. для 5-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання : у 2 ч. / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2019. – Ч. 2. – § 22, 25.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 6-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 6.<br>Валочка, Г. М. Беларуская мова : вучэб. дапам. для 7-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка, В. У. Зелянко, С. А. Язерская. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 1.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 10-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 5, 23, 24 |
| **В1.** Знайдзіце ў ***3-м*** сказе тэксту слова, форма якога не адпавядае граматычнай норме, і запішыце яго правільна.<br><br>**Адказ:** сябе | 1) *сябе* → зваротны займеннік ***сябе*** ў родным склоне мае форму ***сябе*** | Маўленне. Тэкст. Стылістыка. Нормы сучаснай беларускай літаратурнай мовы | Беларуская мова : вучэб. дапам. для 6-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 67.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 10-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, |

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | | | 2020. – § 30 |
| **В2.** З двух прыназоўнікаў, прапанаваных у дужках у ***9-м*** сказе тэксту, вызначце той, які павінен быць ужыты ў дадзеным сказе. Запішыце гэты прыназоўнік.<br><br>**Адказ:** ва | 1) *ва* → перад словам, якое пачынаецца з ***у***, ужываецца прыназоўнік ***ва*** (*ва ўсім*) | Марфалогія і арфаграфія. Службовыя часціны мовы | Валочка, Г. М. Беларуская мова : вучэб. дапам. для 7-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка, В. У. Зелянко, С. А. Язерская. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 44–46.<br>Бадзевіч, З. І. Беларуская мова : вучэб. дапам. для 8-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / З. І. Бадзевіч, І. М. Саматыя. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 3.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 10-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 33 |
| **В3.** Запішыце падкрэслены ў ***9-м*** сказе тэксту назоўнік у форме давальнага склону адзіночнага ліку.<br><br>**Адказ:** рацэ | 1) *рацэ́* → назоўнік 1-га скланення з асновай на зычны гук [***к***] у форме давальнага склону адзіночнага ліку мае націскны канчатак -***э*** | Марфалогія і арфаграфія. Назоўнікі 1-га скланення, правапіс іх склонавых канчаткаў | Беларуская мова : вучэб. дапам. для 5-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання : у 2 ч. / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2019. – Ч. 1. – § 6.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 6-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 31, 32 |
| **В4.** Запішыце падкрэслены ў ***16-м*** сказе тэксту прыметнік у форме назоўнага склону адзіночнага ліку мужчынскага роду.<br><br>**Адказ:** родны | 1) *родны* → прыметнік з асновай на цвёрды зычны ***род***[***н***]*ы* ў форме назоўнага склону адзіночнага ліку мужчынскага роду мае канчатак -***ы*** | Марфалогія і арфаграфія. Скланенне і правапіс прыметнікаў | Беларуская мова : вучэб. дапам. для 6-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 43, 46 |

| **Заданне. Адказ** | **Разбор задання** | **Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу** | **Вучэбны дапаможнік** |
|---|---|---|---|
| **В5.** Ад асновы дзеяслова, падкрэсленага ў ***13-м*** сказе тэксту, утварыце поўны дзеепрыметнік залежнага стану і запішыце яго ў форме назоўнага склону адзіночнага ліку мужчынскага роду.<br><br>**Адказ:** кінуты | 1) *кінуты* → ад асновы неазначальнай формы дзеяслова закончанага трывання ***<u>кінуць</u>*** з дапамогай суфікса *-**т**-* утвараецца поўны дзеепрыметнік залежнага стану ***кінуты***; форма назоўнага склону адзіночнага ліку мужчынскага роду – ***кінуты*** | Марфалогія і арфаграфія. Дзеепрыметнікі незалежнага і залежнага стану, іх утварэнне і правапіс | Валочка, Г. М. Беларуская мова : вучэб. дапам. для 7-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка, В. У. Зелянко, С. А. Язерская. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 23, 24.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 10-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 32 |
| **В6.** Ад асновы дзеяслова, падкрэсленага ў ***5-м*** сказе тэксту, утварыце дзеепрыслоўе і запішыце яго.<br><br>**Адказ:** лунаючы | 1) *лунаючы* → ад асновы дзеяслова цяперашняга часу незакончанага трывання ***<u>луна</u>юць*** з дапамогай суфікса *-**ючы*** ўтвараецца дзеепрыслоўе незакончанага трывання ***лунаючы*** | Марфалогія і арфаграфія. Дзеепрыслоўі незакончанага і закончанага трыванняў, іх утварэнне і правапіс | Валочка, Г. М. Беларуская мова : вучэб. дапам. для 7-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка, В. У. Зелянко, С. А. Язерская. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 31.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 10-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 32 |
| **В7.** З двух прапанаваных у дужках слоў вызначце тое, што адпавядае сэнсу сказа. Запішыце гэта слова ў той граматычнай форме, у якой яно прапанавана:<br>*Усюды, дзе (ладзілі, настройвалі) свае выступленні артысты тэатра Уладзіслава Галубка, яны абавязкова пакідалі памятны запіс: «Тут быў Галубок з галубянятамі».*<br><br>**Адказ:** ладзілі | 1) *ладзіць* → значэнне слова – *‘рабіць, ствараць, спраўляць, арганізоўваць*’;<br>2) *настройваць* → значэнне слова – *‘наладжваць, прыводзіць у патрэбны тэхнічны стан*’;<br>3) сэнсу сказа адпавядае слова ***ладзіць***: *Усюды, дзе ладзілі свае выступленні артысты тэатра Уладзіслава Галубка, яны абавязкова пакідалі памятны запіс: «Тут быў Галубок з галубянятамі».* | Лексіка. Фразеалогія. Слова, яго лексічнае значэнне | Беларуская мова : вучэб. дапам. для 5-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання : у 2 ч. / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2019. – Ч. 2. – § 22.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 6-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка [і інш.]. – |

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | | | Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 6.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 10-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 23 |

**В8.** Вызначце, якія гукі абазначаны падкрэсленымі ў словах літарамі, і ўстанавіце адпаведнасць паміж слупкамі табліцы. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.

| | |
|---|---|
| **А.** Ка**с**ьба. | **1.** [***з’***]. |
| **Б.** Ра**с**чуліць. | **2.** [***с’***]. |
| **В.** Кня**з**ь. | **3.** [***ш***]. |
| **Г.** Развя**з**ка. | **4.** [***с***]. |
| | **5.** [***з***]. |

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| **Адказ:** А1Б3В2Г4 | 1) *ка**с**ьба* → падкрэсленая ў слове літара вымаўляецца як зычны гук [***з’***]: глухі зычны гук [***с’***] перад звонкім зычным гукам [***б***] азванчаецца – [*ка**з’**ба́*];<br>2) *ра**с**чуліць* → падкрэсленая ў слове літара вымаўляецца як зычны гук [***ш***]: свісцячы зычны гук [***с***] прыпадабняецца да шыпячага зычнага гука [***ч***] – [*ра**ш**чу́л’іц’*];<br>3) *кня**з**ь* → падкрэсленая ў слове літара вымаўляецца як зычны гук [***с’***]: звонкі зычны гук [***з’***] на канцы слова аглушаецца – [*кн’а́**с’***];<br>4) *развя**з**ка* → падкрэсленая ў слове літара вымаўляецца як зычны гук [***с***]: звонкі зычны гук [***з***] перад глухім зычным гукам [***к***] аглушаецца – [*раз’в’а́**с**ка*] | Фанетыка і арфаэпія. Арфаграфія. Зычныя гукі. Зычныя цвёрдыя, мяккія, зацвярдзелыя; глухія, звонкія; свісцячыя і шыпячыя. Іх вымаўленне і правапіс | Беларуская мова : вучэб. дапам. для 5-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання : у 2 ч. / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2019. – Ч. 2. – § 13–15.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 10-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 6, 12 |

<table>
<tr><th>Заданне.<br>Адказ</th><th>Разбор задання</th><th>Раздзел праграмы ўступных іспытаў.<br>Элемент зместу</th><th>Вучэбны дапаможнік</th></tr>
<tr><td colspan="4">B9. Устанавіце адпаведнасць паміж фразеалагізмамі і словамі-суправаджальнікамі, з якімі фразеалагізмы ўжываюцца ў маўленні. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.<br><br>А. … да адвалу.<br>Б. … пра запас.<br>В. … боб з гарохам.<br>Г. … за і супраць.<br><br>1. Узважваць<br>2. Хаваць<br>3. Блытаць<br>4. Нагаварыць<br>5. Наесціся</td></tr>
<tr><td>Адказ: А5Б2В3Г1</td><td>1) наесціся да адвалу → слова, з дапамогай якога фразеалагізм рэалізуецца ў маўленні, – наесціся; значэнне фразеалагічнага выразу – ‘наесціся ўволю, без абмежаванняў, колькі захочацца’;<br>2) хаваць пра запас → слова, з дапамогай якога фразеалагізм рэалізуецца ў маўленні, – хаваць; значэнне фразеалагічнага выразу – ‘хаваць на будучае, на той выпадак, калі спатрэбіцца’;<br>3) блытаць боб з гарохам → слова, з дапамогай якога фразеалагізм рэалізуецца ў маўленні, – блытаць; значэнне фразеалагічнага выразу – ‘блытаць розныя, несумяшчальныя рэчы’;<br>4) узважваць за і супраць → слова, з дапамогай якога фразеалагізм рэалізуецца ў маўленні, – узважваць; значэнне фразеалагічнага выразу – ‘узважваць тое, што пацвярджае, апраўдвае якое-небудзь рашэнне, дзеянне ў супастаўленні з тым, што адмаўляе яго’</td><td>Лексіка. Фразеалогія. Фразеалагізмы, іх роля ў маўленні</td><td>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 5-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання : у 2 ч. / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2019. – Ч. 2. – § 32.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 10-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 25</td></tr>
</table>

<table>
<tr><th>Заданне.<br>Адказ</th><th>Разбор задання</th><th>Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу</th><th>Вучэбны дапаможнік</th></tr>
<tr><td colspan="4">B10. Вызначце спосаб утварэння прыведзеных слоў і ўстанавіце адпаведнасць паміж слупкамі табліцы. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.<br><table><tr><td>А. Адлёт.<br>Б. Убаку.<br>В. Славутасць.<br>Г. Вечназялёны.</td><td>1. Суфіксальны.<br>2. Словаскладанне.<br>3. Прыставачны.<br>4. Бяссуфіксны (нульсуфіксальны).<br>5. Прыставачна-суфіксальны.</td></tr></table></td></tr>
<tr><td>Адказ: А4Б5В1Г2</td><td>1) адлёт → слова ўтворана бяссуфіксным (нульсуфіксальным) спосабам: адлёт-Ø-□ ад адлят/а/-ць;<br>2) убаку → слова ўтворана прыставачна-суфіксальным спосабам: у-бак-у ад бок-□;<br>3) славутасць → слова ўтворана суфіксальным спосабам: славут-асць-□ ад славут-ы;<br>4) вечназялёны → слова ўтворана шляхам словаскладання: ад вечна зялён-ы</td><td>Марфемная будова слова. Словаўтварэнне і арфаграфія. Асноўныя спосабы ўтварэння слоў</td><td>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 6-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 18–20, 39.<br>Валочка, Г. М. Беларуская мова : вучэб. дапам. для 7-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка, В. У. Зелянко, С. А. Язерская. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 37.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 10-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 26</td></tr>
</table>